Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 233 (302)
АЎТОРАК
8
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

ВЫХОЎВАЦЬ І ВУЧЫЦЬ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСОВЕТАЎ

У нашай вобласці створана 360 сельскіх Советаў. Звыш 2.000 чалавек былых батракоў, беднякоў, серадпякоў і прадстаўнікоў сельскай інтэлігенцыі прышлі да кіраўніцтва нізавымі органамі совецкай улады на вёсцы.

Работнікі сельсоветаў—гэта людзі, кроўна звязаныя з народам, ведаючыя яго інтарэсы, яго патрэбы. Сюды, у сельскі Совет, працоўныя сяляне ідуць для вырашэння ўсіх пытанняў.

За кароткі перыяд часу сельскія Советы прарабілі вялікую работу па згуртаванню працоўных сялян вакол усіх мерапрыемстваў партыі і ўрада, па растлумачэнню і правядзенню ў жыццё законаў совецкай улады.

Аднак нельга сказаць, што сельскія Советы поўнасцю спраўляюцца з сваімі задачамі, што ўсе сельскія Советы сталі сапраўднымі арганізатарамі актыўнага ўдзелу сялянскіх мас у соцыялістычным будаўніцтве. Было-б памылкова думаць, што раз кіраўнікі сельсоветаў прайшлі спецыяльныя курсы, яны ўжо ведаюць па-сапраўднаму свае функцыі і задачы. Вопыт накапляецца ў працэсе практычнай работы. Кіраўнікі раёнаў павінны дабіцца таго, каб сельсоветы вучыліся на практычнай рабоце, вучыліся на сваіх уласных памылках, каб іх больш не паўтараць. Гутарка ідзе аб тым, каб райвыканкомы і райкомы партыі цярпліва вучылі работнікаў сельсоветаў, уваходзілі-б ва ўсе дэталі іх дзейнасці.

На жаль, стыль кіраўніцтва сельсоветамі ў радзе раёнаў абсалютна нягодны. У сельскія Советы ідзе паток усякіх пісьмовых дырэктыў ад раённых арганізацый, прычым дырэктывы даюць сельсоветам, хто толькі ўздумае. Пішуць загатоўчыя арганізацыі, пішуць лясныя арганізацыі, прычым не проста пішуць, а патрабуюць, а часам — камандуюць. У Сапоцкінскім раёне, напрыклад, загадчык райаддзела ЗАГС'а піша сельсовету дырэктыву і пагражае, што «калі не выканаеце, я з вамі паступлю інакш».

Такую практыку трэба неадкладна зжыць. Трэба, каб самі райвыканкомы менш пісалі паперкі, а кіравалі сельсоветамі шляхам жывой сувязі, жывых указанняў, дзелавых парад.

Многія кіраўнікі сельсоветаў не ведаюць, як аформіць пратакол пасяджэння. Часта бывае так, што на пасяджэнні прэзідыума сельсовета выступае з дакладам старшыня райвыканкома або нават сакратар райкома партыі. Здавалася-б, што такія аўтарытэтныя дакладчыкі павінны былі паказаць, як трэба правільна аформіць рашэнне. Праверкай устаноўлена, што па дакладах кіраўнікоў раёнаў на пасяджэннях сельсоветаў прыняты проста анекдатычныя рашэнні. А прыняць правільнае канкрэтнае рашэнне — гэта пытанне вялікай важнасці, і кіраўнікоў сельсоветаў трэба гэтаму вучыць.

Многія сельсоветы, асабліва ў Гродненскім і Скідэльскім раёнах, працуюць без усякага плана. Пасяджэнні праводзяцца ад выпадку да выпадку, калі прыязджае які-небудзь упаўнаважаны, а паколькі ўпаўнаважаныя прыязджаюць толькі па пытаннях выканання сельскагаспадарчых кампаній, то сельсовет гэтым толькі і займаецца. Мала дзе на пасяджэннях прэзідыума сельсовета абмяркоўваліся такія пытанні, як работа ў школах, арганізацыя проціпажарнай аховы упарадкаванне вёсак, работа хат-чытален, работа сельпо і г. д.

Райвыканкомы павінны праз сваіх работнікаў навучыць кіраўнікоў сельсоветаў складаць планы работы і аказаць дапамогу ў рашэнні гэтых пытанняў. Чаму-б, напрыклад, не выехаць у сельсовет загадчыку райана, вывучыць справу ў школе і паставіць пытанне на пасяджэнні прэзідыума сельсовета? Кожны аддзел райвыканкома павінен лічыць сваім абавязкам дапамагчы сельсоветам, а не толькі прыязджаць і патрабаваць.

У сельсоветы паступае многа скарг. Кіраўнікі сельсоветаў не ведаюць, як іх разбіраць, як адказаць таму, хто скардзіцца, як дабіцца ад той ці іншай арганізацыі, каб яна рэагіравала на законныя скаргі таго ці іншага грамадзяніна. У рэзультаце заявы або падоўгу ляжаць у сельсовеце, або, як у Сапоцкінскім раёне, проста перасылаюцца скаржніку з рэзалюцыяй такога зместу: «Сказана адмовіць». Хто сказаў адмовіць? Чаму адмовіць?— адказу не даюць.

Ці можна ў гэтым вінаваціць толькі кіраўнікоў сельсоветаў? Зразумела, не. Не ўсе яны ведаюць, што ў совецкіх установах да скарг трэба аднесціся з асаблівай чуласцю. А райвыканкомы не вучаць, як патрэбна рэгістрыраваць і ўлічваць скаргі, як патрэбна на іх рэагіраваць і як адказаць скаржніку.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць рабоце з актывам. Трэба навучыць кіраўнікоў сельсоветаў умела падбіраць гэты актыў, а то, на жаль, сярод актывістаў ёсць і такія элементы, якія не выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай. Ёсць і проста варожыя народу людзі. Трэба навучыць кіраўнікоў сельсоветаў адрозніваць сапраўдных актывістаў, людзей, адданых совецкай уладзе, даказваючых гэта на справе, ад ілжэ - актывістаў, здольных толькі падрываць мерапрыемствы совецкай улады. Трэба падказаць кіраўнікам сельсоветаў формы і метады работы з гэтым актывам.

Да гэтага часу побач з сельсоветамі ў многіх вёсках існуюць так званыя сялянскія камітэты. Гэта асабліва мае месца ў Гродненскім, Скідэльскім і Кольнаўскім раёнах. Сялянскія камітэты, якія былі ў свой час арганізаваны, свае функцыі выканалі і не могуць паралельна існаваць, калі ёсць сельскія Советы. Райвыканкомы чамусьці не рэагіруюць на падобныя факты.

Трэба сказаць некалькі слоў аб саміх памяшканнях сельсоветаў. Многія сельсоветы ні па вонкаваму, ні па ўнутранаму свайму выгляду не могуць служыць прыкладам культурнасці. Памяшканні многіх сельсоветаў нават не маюць шыльды, каб кожны грамадзянін ведаў, што тут знаходзіцца такі-та сельсовет, такога-та раёна. Работнікі райвыканкомаў бываюць у сельсоветах, бачаць усё гэта, але не падкажуць, не дапамогуць, каб памяшканні сельсоветаў усім сваім відам вылучаліся ў вёсцы.

Работа сельскіх Советаў вялікая, складаная і рознастайная. Трэба паўсядзённа вучыць і выхоўваць кадры работнікаў сельсоветаў. Гэта абавязак раённых выканаўчых камітэтаў і раённых камітэтаў партыі.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб дапаўненні закона аб усеагульным воінскім абавязку

Дапоўніць закон аб усеагульным воінскім абавязку, прыняты Вярхоўным Советам СССР 1 верасня 1939 года, артыкуламі наступнага зместу:

1. Грамадзяне, прызваныя на сапраўдную ваенную службу, абавязаны з'яўляцца ў воінскія часці ва ўласнай спраўнай вопратцы, маючы пры сабе: пару нацельнай бялізны, адну верхнюю кашулю або верхнюю куртку, адны штаны, спраўны абутак (боты або бацінкі), цёплае паліто або ватнюю куртку, галаўны ўбор і мяшок для ўкладкі ўласных рэчаў.

Пасля прыбыцця ў воінскую часць, залічаным на сапраўдную ваенную службу выдаецца казённае ваеннае абмундзіраванне па ўстаноўленых нормах, а ўласныя рэчы прызыўнікоў прымаюцца воінскімі часцямі на хаванне ў вайсковых складах на ўвесь час знаходжання яго на сапраўднай ваеннай службе.

2. Пры звальненні ў запас з воінскіх часцей радавога і малодшага начальствуючага састава ваеннае абмундзіраванне, якое знаходзіцца ў іх на руках, поўнасцю здаецца ў вайсковыя склады, а ім звaрачаецца іх уласная вопратка.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, крэмль. 4 кастрычніка 1940 г.

СОВЕЦКІ НАРОД АДНАДУШНА АДАБРАЕ ЎКАЗ АБ СТВАРЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРАЦОЎНЫХ РЭЗЕРВАЎ СССР

Голас працоўных Гродна

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** З вялікім задаваленнем сустрэлі працоўныя Гродненскага раёна Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах. У абедзенныя перапынкі і пасля работы на прадпрыемствах горада праходзяць многалюдныя мітынгі, прысвечаныя Ўказу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. На мітынгу рабочых шклозавода выступіў стары майстар-шклодуў тав. Хадроўскі. Ён сказаў:

— Радасна жыць у такой краіне, дзе ўрад клапоціцца і прадастаўляе ўсе ўмовы для набыцця кваліфікацыі дзецям працоўных. Мне хочацца расказаць аб тых цяжкасцях, з якімі мне прышлося атрымаць спецыяльнасць шклодува пры капіталістычным ладзе. 10-гадовым аддаў мяне бацька на шклозавод у якасці адносчыка вырабаў. Працаваў я па 10—12 гадзін у суткі. Для таго, каб атрымаць кваліфікацыю, мне прышлося цяжка працаваць у майстра завода. Я кожны дзень у яго сек дровы, насіў ваду, даглядаў жывёлу. Пасля такой работы раніцой не мог прачнуцца. Тады бацька браў мяне соннага на плечы і нёс на завод.

Канула ў вечнасць праклятае мінулае. Сапраўдную радасць працы я пазнаў пры совецкай уладзе, якая клапоціцца аб працоўных. Мы, грамадзяне заходніх абласцей, асабліва адчуваем гэтыя клопаты. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР — яркае сведчанне гэтаму. Хто пажадае атрымаць спецыяльнасць, чэсна і добрасумленна працаваць на карысць радзімы, — дзяржава прадастаўляе яму ўсе магчымасці.

Усе выступаўшыя на мітынгу горача віталі рашэнне совецкага ўрада. У прынятай на мітынгу рэзалюцыі гаворыцца:

«Каб паспяхова рашыць задачы, пастаўленыя XVIII з'ездам партыі— дагнаць і перагнаць у эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, — нам патрэбны матэрыяльныя і людскія рэзервы. Мы горача вітаем Указ, які накіраван на выкананне гэтай задачы. Мы абавязваемся аказаць дапамогу ў камплектаванні школ і пашлём у іх сваіх сыноў».

З вялікім уздымам прайшоў мітынг на чыгуначным вузле Гродна. Выступіўшы на мітынгу стрэлачнік тав. Саўца заявіў:

— Я маю двух сыноў: адзін вучыцца ў шостым, а другі ў пятым класе. Калі яны скончаць сямігодку, я іх пашлю ў чыгуначнае вучылішча.

Выступаўшыя таварышы гаварылі аб вялікіх клопатах партыі і совецкай улады, якія па-бацькоўску клапоцяцца аб рабочай і калгаснай моладзі.

Калектыў абавязаўся паслаць у школы лепшую, перадавую моладзь.

Ліквідуем недахоп рабочых кадраў

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР» мае вялікае значэнне для соцыялістычнай прамысловасці.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня абкома профсаюза рабочых металавырабаў тав. Хайтовіч заявіў:

— На абслугоўваемых нашым абкомам прадпрыемствах адчуваецца вялікі недахоп кваліфікаваных кадраў. У гэтым няма нічога дзіўнага. Пры ўладзе-ж капіталістаў гэтыя прадпрыемствы працавалі ўсяго 6—8 месяцаў у год у адну змену з вельмі малай нагрузкай.

З велізарнымі цяжкасцямі ўдавалася тады некаторым рабочым атрымаць на заводах кваліфікацыю, прычым вучоба іх працягвалася многа год. Напрыклад, на беластоцкім цвіковым заводзе № 1 рабочыя тт. Багдановіч і Літкоўскі вучыліся па 6—8 гадоў, а зараз, на падставе Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, для падрыхтоўкі новых кадраў для нашых заводаў будуць створаны Рамесленыя Вучылішчы з двухгадовым тэрмінам навучання.

Калі раней на капіталістычных прадпрыемствах вучань плаціў майстру за навучанне, то цяпер вучні будуць знаходзіцца на поўным утрыманні дзяржавы.

На нашых беластоцкіх цвіковых заводах адчуваецца вялікі недахоп токараў, слесараў і дратавікоў. Другі беластоцкі цвіковы завод з-за недахопу рабочых гэтых кваліфікацый працуе ў адну змену, хоць па плану ён павінен перайсці на двухзменную работу. У рэзультаце такога становішча завод выконвае план толькі на 60—70 працантаў. На нашых чыгуна-ліцейных заводах нехапае ліцейшчыкаў і фармоўшчыкаў, на заводах сельскагаспадарчых машын—мантажнікаў, слесараў і токараў.

Зараз праводзіцца рэканструкцыя раду нашых заводаў. Трэба прызнаць, што з-за недахопу рабочай сілы рэканструкцыйныя работы праходзяць вельмі марудна.

Няма ніякага сумнення, што рэалізацыя намечанай урадам абшырнай праграмы навучання новых рабочых раз назаўсёды пакончыць з слабымі старанамі нашых прадпрыемстваў, вынікаючымі з недахопу кваліфікаванай рабочай сілы.

Перад нашымі профсаюзнымі арганізацыямі стаяць велізарныя задачы папулярызацыі Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастаноў Соўнаркома. Мы павінны дабіцца таго, каб моладзь добраахвотна пайшла на вучобу ў ствараемыя школы і вучылішчы.

Агітатары раз'ясняюць Указ

На прадпрыемствах і ва ўстановах Беластока рабочыя і служачыя ажыўлена абмяркоўваюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР. У гаркоме партыі па гэтаму пытанню адбылася нарада сакратароў пярвічных партыйных і комсамольскіх арганізацый. Пасля адбыліся інструкцыйныя нарады агітатараў на прадпрыемствах, ва ўстановах.

У цэхах, чырвоных кутках, чытальнях агітатары праводзяць з рабочымі гутаркі, чытаюць Указ. 5 кастрычніка перад пачаткам работы на чыгуна-ліцейным заводзе правёў гутарку з рабочымі ў цэху агітатар тав. Хоцін. Ён падробна расказаў рабочым сутнасць і вялікае значэнне новага закона.

У Васількове, на восьмым тэкстыльным камбінаце на гутарках агітатараў аб Указе прысутнічала 200 чалавек.

На Беластоцкай 13-й тэкстыльнай фабрыцы гутаркі правялі агітатары тт. Зенін, Салаўёва, Сімін, Іванова і іншыя. У апрэтурным цэху на 4-м камбінаце на гутарцы агітатара тав. Трушынай прысутнічала 30 чалавек.

Рабочыя жыва цікавяцца законам аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах і адабраюць яго, як закон, які накіраван на яшчэ большае ўмацаванне магутнасці нашай радзімы, на бурны росквіт нашай народнай гаспадаркі.

ЗАКОН ВЯЛІКАЙ ВАЖНАСЦІ

На беластоцкім шклозаводзе рабочыя ажыўлена абмяркоўваюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР. Учора пасля работы адбыўся сход рабочых першай змены. Прысутнічала 62 чалавекі. На сходзе быў зачытан Указ і пастанова Соўнаркома СССР «Аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Абучэння.

Дырэктар завода тав. Цёмкін у сваім выступленні сказаў:

— Стварэнне Дзяржаўных рэзерваў СССР дасць магчымасць забяспечыць рабочай сілай усе галіны нашай соцыялістычнай прамысловасці. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР цалкам вынікае з рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б).

Майстар-шклодуў тав. Духноўскі заявіў:

—Для таго, каб правільна развіваць гаспадарку, неабходны працоўныя рэзервы. Для прадпрыемстваў патрэбны слесары, плотнікі і іншыя кваліфікаваныя кадры. Таму Вярхоўны Совет СССР і выдаў новы Указ. Рабочыя з радасцю пашлюць сваіх дзяцей у рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і заводскія школы. У нашай краіне кожны чалавек працуе. Сталінская Канстытуцыя забяспечвае нам права на працу.

Усе рабочыя аднадушна адабраюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах, накіраваны на яшчэ большае ўмацаванне нашай соцыялістычнай радзімы.

XIV З'ЕЗД ЛКСМБ

Дзённік ранішняга пасяджэння

5 кастрычніка 1940 г.

5 кастрычніка ў Мінску у Вялікай зале Дома парткурсаў пры ЦК КП(б)Б адкрыўся XIV з'езд комсамола Беларусі. Прысутнічае 514 дэлегатаў.

Пад бурныя апладысменты ў прэзідыум з'езда выбіраюцца сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка, Кулагін і Малін,- Старшыня СНК БССР тав. Былінскі, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевіч, Нарком Унутраных спраў БССР тав. Цанава, камандуючы войскамі Заходняй Асобай Ваеннай Акругі генерал-палкоўнік танкавых войск тав. Паўлаў, загадчык оргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Эйдзінаў, сакратар Мінскага абкома і гаркома КП(б)Б тав. Матвееў, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Наседкін, сакратары ЦК ЛКСМБ тт. Каралёў, Ефройкін, Чэрнікава і Крыўчонак, сакратар Мінскага абкома комсамола тав. Мальчэўскі, знатныя комсамольцы рэспублікі — Герой Совецкага Саюза тав. Куняжоў, камбайнер-ордэнаносец тав. Гараўцоў, стаханаўка віцебскай фабрыкі «КІМ» ордэнаноска тав. Падскочава і др.

Гарачымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі сустракаюць дэлегаты прапанову аб выбранні ў пачотны прэзідыум з'езда Палітбюро ЦК ВКП(б). Калі называюць імя таварыша Сталіна, усе ўстаюць і наладжваюць бурную авацыю ў чэсць лепшага друга совецкай моладзі.

Авацыі ўспыхваюць з новай сілай, калі пачотным старшынёй з'езда выбіраецца вялікі Сталін.

Зацвярджаецца наступны парадак дня работы з'езда:

1. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ.
2. Справаздача рэвізійнай камісіі.
3. Выбары Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ.
4. Выбары рэвізійнай камісіі.

Пасля выбрання сакратарыята з'езда, мандатнай і рэдакцыйнай камісіі, са справаздачным дакладам аб рабоце Цэнтральнага Камітэта комсамола Беларусі выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Каралёў.

Пасля справаздачнага даклада закончылася ранішняе пасяджэнне з'езда.

Дзённік вячэрняга пасяджэння

5 кастрычніка 1940 г.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд заслухаў справаздачны даклад старшыні Цэнтральнай рэвізійнай камісіі тав. Сенько.

Гаворачы аб выніках пяці рэвізій, праведзеных рэўкамісіяй за справаздачны перыяд, дакладчык адзначае, што ЦК ЛКСМБ не змагаўся за ўстанаўленне цвёрдай фінансавай дысцыпліны, не надаваў сур'ёзнага значэння важнейшаму патрабаванню статута — своечасоваму збору членскіх узносаў. У выніку — паступленне ўзносаў з рада арганізацый ЛКСМБ праходзіць недапушчальна марудна. Дзевяцімесячнае заданне, напрыклад, па Віцебскай вобласці выканана на 63 проц., па Палескай— на 65,2 проц., па Магілеўскай — на 72 проц. Па рэспубліцы план выканан на 79,7 проц., г. зн. недаатрымана 573 тысячы рублёў.

ЦК ЛКСМБ нават і пасля неаднаразовых указанняў з боку рэўкамісіі і спецыяльнага ўказання ЦК ВЛКСМ не прыняў рашучых мер да кіраўнікоў, якія дапусцілі вялікую запазычанасць па членскіх узносах.

Пасля справаздачы рэвізійнай камісіі пачаліся спрэчкі па справаздачных дакладах.

Першай выступіла сакратар Пінскага абкома комсамола тав. Сысоева.

— Пінская абласная комсамольская арганізацыя, — гаворыць яна, — створана нядаўна. У яе радах многа маладых комсамольцаў. Яны паказваюць узоры большэвіцкіх адносін да працы. Больш 200 комсамольцаў служылі прыкладам у рабоце на будаўніцтве Днепра-Бугскага канала.

У вобласці арганізавана 57 калгасаў, у 36 з іх створаны пярвічныя комсамольскія арганізацыі, якія адыгрываюць вялікую ролю ў жыцці і рабоце калгасаў, у іх арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні.

З вялікай увагай слухалі дэлегаты выступленне звеннявой калгаса імені Сталіна, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці, тав. Берташ.

— Наша комсамольская арганізацыя, — гаворыць яна, — налічвае 15 членаў. Маладыя комсамольцы актыўна ўключыліся ў работу калгаса. Умацоўваючы працоўную дысцыпліну, яны сістэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Комсамольская арганізацыя карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калгаснікаў.

На трыбуне сакратар Уздзенскага райкома комсамола тав. Осмалоўскі. Ён гаворыць аб тым, што комсамольская арганізацыя раёна палепшыла сваю работу, пачала займацца практычнымі пытаннямі жыцця калгасаў. Комсамольцы сельгасарцелі «Чырвоны Кастрычнік» узнялі пытанне аб загатоўцы торфу для ўгнаення. Комсамольскія арганізацыі раёна падтрымалі гэта каштоўнае мерапрыемства. У рэзультаце загатоўлена звыш 100 тысяч тон торфу.

Тав. Осмалоўскі рэзка крытыкаваў аддзел сялянскай моладзі ЦК комсамола за адсутнасць належнай дапамогі калгасным комсамольскім арганізацыям. У рэспубліцы слаба пастаўлена работа па падрыхтоўцы трактарыстак, аднак гэтым пытаннем ЦК ЛКСМБ мала займаўся.

Сакратар Палескага абкома комсамола тав. Прыхажан прысвяціла сваё выступленне пастаноўцы прапаганды і агітацыі. Яна расказала, што 12 тысяч комсамольцаў і моладзі вобласці сістэматычна працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Тав. Прыхажан папракнула комсамольскія газеты «Чырвоная змена» і «Сталинская молодежь» у тым, што яны вельмі мала асвятляюць на сваіх старонках пытанні прапаганды і агітацыі, не змяшчаюць лекцый і кансультацый.

Тав. Мальчэўскі — сакратар Мінскага абкома ЛКСМБ у сваім выступленні расказаў аб росце комсамольскай арганізацыі вобласці. За справаздачны перыяд у комсамол прынята 28 тысяч чалавек, у тым ліку 11.500 дзяўчат. 3.422 комсамольцы прыняты ў рады большэвіцкай партыі. Тав. Мальчэўскі спыніўся таксама на фактах дрэннай работы некаторых вытворчых арганізацый Мінска, гаварыў аб слабай комсамольскай дысцыпліне ў радзе арганізацый вобласці.

Сакратар Полацкага райкома комсамола тав. Ільеў расказаў аб актыўным удзеле калгасных комсамольскіх арганізацый у вытворчай рабоце. Ён крытыкаваў ЦК ЛКСМБ за недастатковую жывую сувязь з райкомамі комсамола. Інструктары ЦК комсамола, прыязджаючы ў раён, мала бываюць на прадпрыемствах і ў калгасах.

На вячэрнім пасяджэнні ў спрэчках выступілі таксама тт. Галенчык (Ліда), Афанасьеў (Свенцяны), Маўрын (Беласток), Каробка (Н-ская часць), Глушанкова (Аршанскі ільнокамбінат) і Барсток (Чашнікі)

6 кастрычніка работа з'езда прадаўжаецца. (БЕЛТА).

Зацверджан СНК СССР 4 кастрычніка 1940 г.

ЗАГАД № 1

Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК СССР

г. Масква, 4 кастрычніка 1940 г.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ К ПАЧАТКУ ВУЧЭБНАГА ГОДА І АБ ПРЫЁМЕ ГАРАДСКОЙ І КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ У РАМЕСЛЕНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ, ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ І Ў ШКОЛЫ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКАГА АБУЧЭННЯ.

У выкананне Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад 2 кастрычніка 1940 года «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР» і пастановы Соўнаркома Саюза ССР ад 2 кастрычніка 1940 года «Аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Абучэння» загадваю:

1. У Рамесленыя Вучылішчы і ў Чыгуначныя Вучылішчы прымаць гарадскую і калгасную моладзь мужчынскага полу ва ўзросце 14—15 год, з адукацыяй не менш чым у аб'ёме пачатковай школы або чатырох класаў сярэдняй школы.

2. У школы Фабрычна-Заводскага Абучэння прымаць гарадскую і калгасную моладзь мужчынскага полу ва ўзросце 16—17 год, незалежна ад агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі.

3. Навучаючыяся як мужчынскага, так і жаночага полу школ Фабрычна-Заводскага Вучнёўства, рэарганізуемых у Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння, карыстаюцца пераважным правам прыёму ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння.

4. Пры прыёме ў Чыгуначныя Вучылішчы перавагу прадастаўляць дзецям работнікаў чыгуначнага транспарта.

5. Дазволіць дырэктарам Рамесленых Вучылішчаў, Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна-Заводскага Абучэння прымаць з школ фабрычна-заводскага вучнёўства, рэарганізуемых у Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння, у выглядзе выключэння, тых навучаючыхся, як мужчынскага, так і жаночага полу, якія маюць узрост вышэй устаноўленага для прыёму ў Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы ФЗА.

6. Зыходзячы з таго, што ў Рамесленых Вучылішчах і Чыгуначных Вучылішчах падрыхтоўваюцца рабочыя складаных прафесій, увесці ў Рамесленых Вучылішчах і ў Чыгуначных Вучылішчах, апрача вытворчага абучэння, выкладанне агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплін, звязаных з абучэннем данай прафесіі.

7. Устанавіць пачатак вучэбнага года ў Рамесленых Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння — з 1 верасня. Як выключэнне у 1940 годзе вучэбны год пачаць у Рамесленых Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і школах Фабрычна-Заводскага Абучэння з 1 снежня.

8. Працягласць вучэбнага дня ў Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчах вызначыць у 7 гадзін, зыходзячы з разліку — 5 гадзін на вытворчае абучэнне і 2 гадзіны на агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны.

9. Працягласць вучэбнага дня ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння вызначыць у 8 гадзін.

10. Абучэнне ў Рамесленых Вучылішчах і ў Чыгуначных Вучылішчах — бясплатнае. Навучаючыяся ў перыяд абучэння забяспечваюцца за кошт дзяржавы падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, харчаваннем, вопраткай, спецвопраткай, бялізнай, абуткам, а прыбыўшыя з сельскіх мясцовасцей і іншагароднія таксама і інтэрнатам.

11. Увесці для навучаючыхся Рамесленых Вучылішчаў і Чыгуначных Вучылішчаў спецыяльную форму адзення.

12. Абучэнне ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння — бясплатнае. Навучаючыяся школ ФЗА ў перыяд абучэння забяспечваюцца за кошт дзяржавы харчаваннем, бялізнай і спецвопраткай, а прыбыўшыя з сельскіх мясцовасцей і іншагароднія таксама і інтэрнатам.

13. Пасля сканчэння Рамесленага Вучылішча, Чыгуначнага Вучылішча або школы Фабрычна-Заводскага Абучэння кожнаму навучаючамуся выдаецца атэстат аб сканчэнні вучылішча або школы па форме, устаноўленай Галоўным Упраўленнем Працоўных Рэзерваў, з абавязковым указаннем у ім аб здачы пробы або іспытаў на пэўны разрад па сваёй прафесіі.

14. Устанавіць, што ў Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчах павінны быць: дырэктар вучылішча, загадчык вучэбна-вытворчай часткі, выкладчыкі па агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплінах, адзін старшы майстар на кожнае вучылішча і, апрача таго, адзін майстар па абучэнню прафесіі на кожныя 25 чалавек навучаючыхся.

У інтэрнатах Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчаў павінны быць: камендант інтэрната і выхавальнік па ваенна-фізкультурнай падрыхтоўцы, падпарадкаваныя дырэктару вучылішча.

15. Устанавіць, што ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння павінны быць: дырэктар школы, адзін старшы майстар на школу і, апрача таго, адзін майстар на кожныя 30—40 чалавек навучаючыхся.

У інтэрнатах школ Фабрычна-Заводскага Абучэння павінен быць камендант інтэрната, падпарадкаваны дырэктару школы.

16. Устанавіць, што кожнае Рамесленае Вучылішча, Чыгуначнае Вучылішча і кожная школа Фабрычна-Заводскага Абучэння мае самастойны бюджэт.

17. Дазволіць Рамесленым вучылішчам, Чыгуначным Вучылішчам і школам Фабрычна-Заводскага Абучэння выконваць элементарныя вытворчыя заказы дзяржавы. Устанавіць, што адна трэць даходаў, атрымліваемых ад выканання гэтых заказаў, а таксама за работу, выкананую навучаючыміся ў працэсе абучэння на вытворчасці, паступае ў дзяржаўны бюджэт, адна трэць астаецца ў распараджэнні дырэктара на расшырэнне вучылішча або школы ФЗА і на культурна-бытавое абслугоўванне навучаючыхся, майстраў і выкладчыкаў і адна трэць выдаецца на рукі навучаючымся, выконваючым работы.

18. Зацвердзіць наступны план размеркавання прызываемых для ўкамплектавання Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна - Заводскага Абучэння на 1 снежня 1940 года па абласцях, краях і рэспубліках:

Абласці, краі, рэспублікі	Кантынгент навучаючыхся			Усяго
	Рамесленыя вучылішчы	Чыгуначныя вучылішчы	ФЗА	
Ленінградская	67000	900	9000	76900
Маскоўская	63000	1660	10000	74660
Горкаўская	15000	250	3000	18250
Харкаўская	10000	900	6000	16900
Растоўская	10000	200	7000	17200
Сталінская	8000	810	27000	35810
Свердлоўская	8000	400	8000	16400
Днепрапетроўская	7200	700	7400	15300
Молатаўская	7000	170	3000	10170
Чэлябінская	7000	670	8000	15670
Варонежская	6800	900	5000	12700
Варашылаўградская	6000	—	8000	14000
Новасібірская	6000	850	2000	8850
Азербайджанская ССР	5000	—	5000	10000
Кіеўская	5000	600	6000	11600
Тульская	5000	620	7000	12620
Орлоўская	4750	750	6000	11500
Нікалаеўская	5000	—	3000	8000
Куйбышэўская	4800	—	6000	10800
Сталінградская	4450	250	7000	11700
Запарожская	4500	230	6000	10730
Беларуская ССР	4500	1660	10000	16160
Одэская	4000	400	3000	7400
Яраслаўская	4000	300	4000	8300
Саратаўская	3500	500	2500	6500
Крымская АССР	3000	450	1200	4650
Удмуртская АССР	3000	—	1600	4600
Іванаўская	2800	—	7000	9800
Грузінская ССР	2800	300	1600	4700
Калінінская	2800	550	1500	4850
Краснадарскі край	2600	500	2000	5100
Татарская АССР	1800	—	3000	4800
Смаленская	1700	300	6000	8000
Пензенская	1600	250	2600	4450
Чкалаўская	1500	550	3000	5050
Архангельская	1500	—	2000	3500
Курская	1400	330	2500	4230
Башкірская АССР	1200	350	1200	2750
Карэла-Фінская ССР	1200	—	1000	2200
Іркуцкая	1200	400	3000	4600
Разанская	1200	500	1500	3200
Тамбоўская	1200	630	1000	2830
Сумская	1200	450	800	2450
Чэчэна-Інгушская АССР	1200	—	3000	4200
Омская	1000	800	2000	3800
Прыморскі край	800	300	4000	5100
Казахская ССР	800	1180	3500	5480
Хабараўскі край	550	450	4000	5000
Кіраўская	800	300	4000	5100
Краснаярскі край	800	380	1400	2580
Чыцінская	800	400	1000	2200
Дагестанская АССР	800	—	500	1300
Палтаўская	800	300	1500	2600
Бурат-Мангольская АССР	600	280	600	1480
Армянская ССР	600	—	400	1000
Валагодская	600	200	1400	2200
Житомірская	400	—	1600	2000
Вінніцкая	400	430	400	1230
Паўночна-Осецінская АССР	400	200	400	1000
Комі АССР	400	—	400	800
Чэрнігаўская	400	—	600	1000
Алтайскі край	400	250	400	1050
Кіраваград	400	—	400	800
Мардоўская АССР	400	300	—	700
АССР Немцаў Паволжжа	300	—	400	700
Узбекская ССР	—	600	4000	4600
Туркменская ССР	—	200	1000	1200
Орджанікідзеўскі край	400	250	800	1450
Чувашская АССР	—	200	500	700
Каменец-Падольская	—	—	400	400
Львоўская	—	300	—	300
Ровенская	—	150	—	150

19. Устанавіць, што для Маскоўскай, Ленінградскай, Сталінскай, Варашылаўградскай, Свердлоўскай абласцей, Прыморскага і Хабараўскага краёў і Карэла-Фінскай ССР апрача прызыва (мабілізацыі) гарадской і калгаснай моладзі ў прадзелах сваёй вобласці, края, рэспублікі, —дадаткова выдзяляецца для ўкамплектавання Рамесленых Вучылішчаў, Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна-Заводскага Абучэння, згодна кантынгентаў, указаных у пункце 18 гэтага загада, наступная колькасць прызываемых у вучылішчы і школы з іншых абласцей:

У Маскоўскую вобласць — 25.000 чал.; у тым ліку:

З Разанскай вобласці — 7.000 чалавек.

З Курскай вобласці — 7.000 чалавек.

З Орлоўскай вобласці — 6.000 чалавек.

З Тамбоўскай вобласці — 5.000 чалавек.

У Ленінградскую вобласць — 36.500 чал.; у тым ліку:

З Беларускай ССР — 13.500 чалавек.

З Калінінскай вобласці — 11.000 чалавек.

З Смаленскай вобласці — 8.000 чалавек.

З Валагодскай вобласці — 4.000 чалавек.

У Сталінскую вобласць — 20.000 чалавек; у тым ліку:

З Татарскай АССР — 5.000 чалавек.

З Беларускай ССР — 4.000 чалавек.

З Палтаўскай вобласці — 3.000 чалавек.

З Орлоўскай вобласці—3.000 чалавек.

З Курскай вобласці — 3.000 чалавек.

З Сумскай вобласці — 2.000 чалавек.

У Прыморскі край.

З Новасібірскай вобласці — 2.000 чалавек.

У Варашылаўградскую вобласць.

З Чэрнігаўскай вобласці — 1.700 чалавек.

У Свердлоўскую вобласць.

З Башкірскай АССР — 1.300 чалавек.

У Карэла-Фінскую ССР.


З Валагодскай вобласці — 1.000 чалавек.

У Хабараўскі край.

З Омскай вобласці — 800 чалавек.

20. Асобы, прынятыя ў Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы ФЗА ў парадку добраахвотнага набору, будуць лічыцца мабілізаванымі і на іх будуць распаўсюджвацца ўсе правы і абавязкі прынятых у парадку мабілізацыі.

Начальнік Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў П. МАСКАТАЎ.



Механік-стаханавец беластоцкай табачнай фабрыкі І. К. Лукашэвіч забяспечвае выдатную работу механізмаў. На здымку: тав. Лукашэвіч за рэгуліроўкай механізмаў. Фота А. Сапіра.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Тэрытарыяльная партыйная арганізацыя ў Васількове (Беластоцкі раён) па колькасці членаў і кандыдатаў ВКП(б) з'яўляецца зусім невялікай. Але работа ў ёй пастаўлена нядрэнна. Комуністы сістэматычна вядуць масава-палітычную работу ў цэхах 8-га тэкстыльнага камбіната. Комуніст т. Кіселкін прачытаў даклад на тэму: «Соцыялістычная праца на совецкіх прадпрыемствах». Штодзённыя гутаркі на палітычныя тэмы праводзяць з рабочымі комуністы тт. Літэмін, Быкаў, Горла і іншыя.

Асабліва многае зроблена па растлумачэнню Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. У сувязі з гэтым на камбінаце рэзка павысілася прадукцыйнасць працы. Калі раней план выконваўся не больш, чым на 77 процантаў, то жнівеньскі план па камбінату выканан на 99 процантаў. У верасні вытворчы план выканан на 108 проц., звыш плана дана дзяржаве 12 тысяч метраў тканіны. Выпуск тканіны лепшых сартоў павысіўся з 54 да 80 процантаў.

Нядрэнна пастаўлена сярод комуністаў партыйная вучоба. Кандыдат партыі тав. Ерж вывучае зараз 11-ты раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Асноўныя моманты пройдзенага ён канспектыруе. Тав. Кіселкін яшчэ ў ліпені закончыў вывучэнне «Кароткага курса» і прыступіў да самастойнага вывучэння асобных твораў Владзіміра Ільіча Леніна.

Партыйнай арганізацыяй пры камбінаце створан таксама гурток па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». У ім займаюцца інжынерна-тэхнічныя работнікі. Рэгулярна выходзіць насценная газета.

Вялікую дапамогу комуністам аказваюць комсамольцы, іх на камбінаце—11 чалавек. Комсамольцы тт. Рабіновіч і Кац перайшлі на абслугоўванне чатырох станкоў і значна перавыконваюць свае нормы.

Комуністы Васількоўскай партарганізацыі, замацаваўшы дасягнутыя поспехі, павінны звярнуць увагу на паляпшэнне ўнутрыпартыйнай работы, на разгортванне работы з беспартыйным актывам.

А. Есіповіч.

Сур'ёзна рыхтуюцца да партыйных сходаў

Партыйная арганізацыя 2-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната (сакратар тав. Дзянісава) сур'ёзна рыхтуецца да партыйных сходаў, прымае ўсе меры да таго, каб сходы праходзілі на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

За некалькі дзён тав. Дзянісава апавяшчае комуністаў аб дні правядзення схода, паведамляе аб паваестцы дня. Комуністы, ведаючы, якія пытанні будуць абмяркоўвацца на сходзе, загадзя рыхтуюцца да выступлення. Для больш падрабязнага асвятлення кожнага пытання на сходзе, тав. Дзянісава вылучае аднаго або некалькі членаў партыі для папярэдняй праверкі таго ці іншага ўчастка работы. Вылучаныя таварышы дакладваюць сходу аб выяўленым і адначасова ўносяць рад прапаноў.

На камбінаце была дрэнна арганізавана барацьба за якасць прадукцыі. Партарганізацыя рашыла знайсці прычыну гэтаму. Сакратар арганізацыі паставіла пытанне на партыйным сходзе. А перад гэтым яна выдзеліла брыгаду з тэхнічна-пісьменных таварышоў — Буйла, Лецеміна і Бурава, якія заняліся праверкай і выяўленнем прычын выпуску прадукцыі дрэннай якасці. У выніку праверкі аказалася, што на камбінаце не была ўведзена якасная прыёмка сыравіны. Майстры, памочнікі майстраў, увесь інжынерна-тэхнічны персанал скінулі з сябе ўсякую адказнасць за якасць прадукцыі. Не захоўваўся рэжым прамыўкі. Брыгада ўстанавіла, што аддзел тэхнічнага кантролю і браковачнага апарата не ўдзяляе дастатковай увагі разбракоўцы тавару.

Выступіўшыя ў спрэчках комуністы тт. Янчук, Літвін і іншыя дапоўнілі праверачную камісію і ўнеслі рад прапаноў, накіраваных на паляпшэнне якасці прадукцыі. Адразу пасля схода арганізаван грамадскі агляд абсталявання.

У выніку праведзенай работы камбінат дабіўся паляпшэння якасці і павелічэння выпуску прадукцыі першага сорту. Калі да гэтага партсхода ў жніўні месяцы было выпушчана першага сорту прадукцыі 70—75 процантаў, то пасля схода ў верасні першы сорт прадукцыі ўжо склаў 81,9 процанта, а за два дні кастрычніка—95,5 процанта.

А. Стасенка.

У ГУРТКУ ПА ВЫВУЧЭННЮ ГІСТОРЫІ ПАРТЫІ

Слухачы гуртка пачалі збірацца задоўга да пачатку заняткаў. Яны размясціліся ва ўтульным і светлым пакоі. Адны ўважліва праглядалі канспекты, правяралі сябе, як усвоілі пройдзены матэрыял, другія праглядалі кнігі.

У назначаны час кіраўнік гуртка тав. Хейман пачаў заняткі.

— Здаецца, ўсе? — спытаў ён, яшчэ раз паглядзеўшы ў спісак.

Як і заўсёды, слухачы сядзелі на сваіх месцах.

Гурток па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», які працуе пры гродненскім партыйным кабінеце, наведвае 14 чалавек. Гэта рабочыя, стаханаўцы прадпрыемстваў. Яны з зацікаўленасцю і ахвотай вучацца, павышаюць свой ідэйна-палітычны ўзровень. Некаторым з слухачоў прышлося пачынаць вывучэнне гісторыі партыі ва ўмовах казематаў і турмаў, хаваючыся ад паліцыі.

Заняткі гуртка акуратна наведвае стаханавец веласіпеднага завода, начальнік цэха тав. Атлас. Ён сістэматычна вядзе канспект і на заняткі прыходзіць падрыхтаваным. Разам з ім займаецца і комсамолец тав. Ліпец—арганізатар першай стаханаўскай маладзёжнай брыгады.

— Кожныя заняткі,—гаворыць ён,—усё больш і больш абагачаюць мае веды, заахвочваюць яшчэ лепш вучыцца.

З выключнай зацікаўленасцю, захапленнем працуе над гісторыяй партыі комсамолка тав. Калешчук. Яна вядзе падрабязныя запісы лекцый, тлумачэнні кіраўніка гуртка, самастойна працуе над падручнікам і асобнымі творамі класікаў марксізма-ленінізма.

Па-дзелавому, арганізавана і ажыўлена праходзяць заняткі. Разбіраючы тую ці іншую тэму, слухачы прыводзяць рад цікавых мясцовых матэрыялаў. Калі гурток вывучаў варожую дзейнасць зубатаўшчыны, некаторыя слухачы прыпомнілі і расказалі факты аб падрыўной рабоце зубатаўскай паліцэйскай арганізацыі ў Гродне.

Рэгулярна, чатыры разы ў месяц, праходзяць заняткі. Да кожнай тэмы падбіраецца дапаможная літаратура. Гэта дапамагае глыбей вывучаць гісторыю партыі.

— Вучоба ў гуртку, — гаворыць рабочы гарадской друкарні тав. Каплан,—шырэй раскрыла мне вочы, пашырыла мой кругазор. Я пачаў разумець законы развіцця чалавечага грамадства, барацьбу працоўных з эксплаататарамі за сваё сонечнае будучае, за комунізм.

Гурток заслужана лічыцца адным з лепшых у Гродне. Слухачы гуртка сістэматычна працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

С. Партной.

Агітатары на былым выбарчым участку

Партыйная арганізацыя Беластоцкага чыгуначнага аддзялення міліцыі праводзіць вялікую агітацыйную работу на былым выбарчым участку. Агітатарамі вылучана 16 таварышоў. Заняткамі ў гуртках ахоплена каля 200 чалавек. Ва ўсіх гуртках праведзена па 4—5 заняткаў, на якіх вывучаны рашэнні VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Заняткі праходзяць арганізавана пры высокай актыўнасці слухачоў. Агітатары скарыстоўваюць геаграфічныя карты і іншыя наглядныя дапаможнікі, прыводзяць многа яркіх фактаў з мясцовага жыцця.

Агітатар тав. Міхайлаў перад пачаткам навучальнага года правёў гутарку з дзецьмі дома аб совецкай школе. Гутарка вельмі спадабалася дзецям.

Партыйнае бюро два разы на пасяджэнні заслухоўвала пытанні аб рабоце агітатараў. Таварышы Анікін, Кузьміных недастаткова рыхтаваліся да заняткаў. Партыйнае бюро зрабіла ім заўвагі, і яны выправілі недахопы.

Партыйная арганізацыя часта арганізоўвае лекцыі па гісторыі партыі і міжнароднаму становішчу. 16 верасня была лекцыя на тэму: «Войны справядлівыя і несправядлівыя».

Цяпер комуністы ўнеслі прапанову арганізаваць у гуртках на былым выбарчым участку вывучэнне даклада таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП(б). Партыйнае бюро зараз падрыхтоўвае рэалізацыю гэтай каштоўнай прапановы.

П. Дудо.



На беластоцкім прызыўным пункце.

На здымку: стаханавец першай дыстанцыі сувязі Беластоцкай чыгункі, старшы электрамеханік тав. К. В. Барадоўка перад прызыўной камісіяй.

Фота А. Сапіра.

ПРЫЗЫЎ У ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ

Выключная арганізаванасць

У горадзе Гродне заканчваецца прызыў у рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Гарадскі ваенны камісарыят, партыйныя і комсамольскія арганізацыі правялі прызыў як важнейшую палітычную кампанію.

Па ўсіх прадпрыемствах горада праведзена вялікая палітычна-выхаваўчая работа. На прызыўным пункце штодзённа праводзіліся гутаркі, даклады, лекцыі, якімі кіравалі лепшыя агітатары, вылучаныя гаркомам партыі. Былі арганізаваны канцэрты, паказ кінокарцін, працаваў стол даведак і т. д.

Прызыў праходзіць з вялікім уздымам. Маладыя совецкія грамадзяне з гордасцю прынялі на сябе пачотнае званне воінаў доблеснай Чырвонай Арміі. Прызваныя ў рады РСЧА маладыя працоўныя горада абяцалі быць прыкладнымі байцамі, дастойнымі высокага звання чырвонаармейца. Выдатнік вучобы настаўніцкага інстытута Александр Галубко заявіў:

Я доўга чакаў дня прызыву. Абяцаю быць выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Прызыўнік-стаханавец скурзавода тав. Шпліндэр на пытанне, дзе жадае служыць, адказаў:

— Жадаю служыць у артылерыі. Запэўніваю, што буду з усёй сур'ёзнасцю вывучаць ваенную справу. За сваю радзіму—Саюз Сэвецкіх Соцыялістычных Рэспублік, за партыю большэвікоў, за Сталіна я гатоў хоць сёння аддаць сваё жыццё.

Так думае, так гаворыць уся наша працоўная моладзь.

Многія прызыўнікі ідуць у рады Чырвонай Арміі членамі слаўнага комсамола, маюць па 2-3 абаронных значкі.

У прызыўную камісію паступіла нямала заяў ад моладзі, якая ў гэтым годзе не прызываецца, з просьбай прыняць у Чырвоную Армію.

Яўка моладзі на прызыўны пункт была выключна арганізаванай і своечасовай. Не было нават ніводнага выпадку спазнення.

Г. Нікалаеў,
старшыня гродненскай прызыўной камісіі.

Усё гатова да сустрэчы новага папаўнення

Дзейсную падрыхтоўку да сустрэчы новага папаўнення разгарнула камандаванне, партыйная і комсамольская арганізацыі часці, дзе камандзірам тав. Васільеў. У асноўным закончана абсталяванне інтэрната, у якім будуць першы час жыць маладыя байцы. Абсталяван ленінскі куток.

Камандаванне вылучыла спецыяльную групу сярэдніх і малодшых камандзіраў па прыёму маладых воінаў Чырвонай Арміі. Яны-ж будуць уводзіць моладзь у курс армейскага жыцця. Састаўлены праграмы для першай ступені навучання маладых байцоў. Малодшыя камандзіры праходзяць кароткатэрміновы інструктыўны збор па пытаннях, як арганізаваць работу з новым папаўненнем.

Сярод малодшых камандзіраў, вылучаных для работы з новым папаўненнем,—камандзір аддзялення, комсамолец тав. Еўтушэнка. Патрабавальны да сябе і да сваіх падначаленых, тав. Еўтушэнка штодзённа паказвае ўзоры чоткага выканання загадаў камандавання. Працуючы па матэрыяльнай частцы сувязі, ён дабіўся выдатных паказчыкаў у баявой і палітычнай вучобе, заслужана лічыцца адным з лепшых малодшых камандзіраў падраздзялення.

Да сустрэчы новага папаўнення ў часці ўсё гатова. Днямі маладыя байцы прыбудуць у часць. З першых-жа дзён іх акружаць клопатамі і ўвагай, іх будуць выхоўваць мужнымі, смелымі і адважнымі.

Ал. Окунеў.

ШКОЛА БАЯВОЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ ВУЧОБЫ

Чырвонаармейцу Новікаву запамятаўся той дзень, калі яго праводзілі ў армію. Іх калгас «Чэлюскінец» закончыў к таму часу асноўныя палявыя работы. Адбываўся папярэдні падлік даходаў, — ураджай быў багатым.

Калгаснікі вышлі праводзіць прызыўнікоў. Яны цёпла, па-таварыску паціскалі ім рукі на развітанне, наказвалі чэсна несці службу.

— Не падвяду, буду выдатным чырвонаармейцам, — шчыра заявіў Новікаў.

І вось малады баец прыбыў у падраздзяленне. Ён быў не адзін. Усе яны да гэтага жылі ў розных месцах нашай вялікай краіны, займаліся рознымі справамі, мелі розную падрыхтоўку, розныя прафесіі.

Але тут ім прадстаяла заняцца адной справай, вялікай і пачотнай — добра авалодаць ваеннымі і палітычнымі ведамі.

Пачалася баявая і палітычная вучоба, цікавая і разам з тым цяжкая, патрабуючая мабілізацыі ўсіх сіл і здольнасцей. Новікаў памятаў свае абяцанні аднавяскоўцам.

Але быць выдатнікам не так проста. Камандзіры на ацэнкі не шчодры. Яны ўзважваюць усё, улічваюць кожны крок.

І калі з баявой падрыхтоўкай справа пачала наладжвацца хутка, то па палітпадрыхтоўцы ён значна адставаў.

Новікаў звярнуўся за дапамогай да таварышоў. Яму ахвотна дапамаглі. Ён навучыўся састаўляць канспекты, чытаць і разумець палітвучэбнік і іншыя палітычныя артыкулы.

... Час ішоў. У напружанай вучобе, вялікім жыцці непрыкметна мільгацелі дні. Новікаў і сам не заўважаў, як ён усё менш звяртаўся за дапамогай да таварышоў.

Гутаркі па пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі совецкага ўрада з'яўляюцца любімымі заняткамі байцоў. Новікаў прымае ў іх актыўны ўдзел.

Вучэбны перыяд надыходзіць к канцу. Пачаліся інспектарскія агляды баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Надышла чарга і да падраздзялення, у якім служыць Новікаў.

Ён цвёрда і ўпэўнена адказваў на пытанні. Ён расказваў аб асаблівасцях Чырвонай Арміі, прыводзіў прыклады з жыцця яго падраздзялення. Новікаў атрымаў добрую ацэнку. За год вучобы палітычны рост байца велізарны.

А колькі такіх, як Новікаў, прыбываюць штогодна ў рады Чырвонай Арміі! Усе яны разам з аўладаннем ваеннай спецыяльнасцю праходзяць сур'ёзную школу палітычнага выхавання.

Вось курсант Міхайлаў. Да службы ў Чырвонай Арміі ён быў выкладчыкам гісторыі ў сярэдняй школе. І тут, у падраздзяленні, дзе ён рыхтуецца стаць малодшым камандзірам, ён не спыняе сваю палітычную і агульна - адукацыйную падрыхтоўку. Міхайлаў — лепшы агітатар у падраздзяленні. Яго лекцыі і таварыскія гутаркі байцы любяць і слухаюць уважліва.

Сістэма палітычнай вучобы, масавая работа — усё гэта служыць вялікай справе выхавання байцоў у духу комунізма, у духу любві да радзімы.

— У радах Чырвонай Арміі я з першых дзён адчуў спрыяючую абстаноўку для вучобы, для ідэйна-палітычнага росту, — расказвае чырвонаармеец - выдатнік тав. Колас.

Чырвоная Армія — школа палітычнага выхавання. У яе радах маладыя патрыёты совецкай радзімы атрымоўваюць патрэбную загартоўку, вялікую сілу волі да перамогі, храбрасць і рашучасць.

Г. Лазараў

Хутчэй закончыць асеннія сельскагаспадарчыя работы.

ЯК У БЕЛАСТОЦКІМ РАЁНЕ КІРУЮЦЬ УБОРКАЙ БУЛЬБЫ

У Беластоцкім райвыканкоме і райкоме партыі не супроць пахваліцца, што яны апаратыўна кіруюць уборкай бульбы, аказваюць дапамогу сельсоветам і калгасам. Наколькі гэта адпавядае сапраўднасці, прывядзем факты.

Старшыня Харашчанскага сельсовета тав. Песін гаворыць, што Харашч часта наведваюць прадстаўнікі раённых арганізацый па пытанню ўборкі бульбы. Тры дні таму назад у сельсовет прыязджаў прадстаўнік райкома партыі. Ён доўга гутарыў з старшынёй сельсовета, распытваў яго пра ўборку і загатоўкі бульбы, «даваў установкі і ставіў перад сельсоветам задачы». Прасядзеўшы дзень, не выходзячы з канцылярыі сельсовета, прадстаўнік развітаўся. Каб пабываць у вёсках і пазнаёміцца з ходам уборкі бульбы, у яго нехапіла часу.

У некаторых вёсках сельсовета надзвычайна марудна ўбіраюць бульбу, слаба арганізавана здача яе дзяржаве. Ёсць такія сялянскія гаспадаркі, якія яшчэ не прыступілі да здачы бульбы дзяржаве. Селянін вёскі Жолткі Пётр Яцэвіч павінен здаць 13 цэнтнераў бульбы, але да гэтага часу не здаў ні аднаго кілограма. У вёсцы Рушчаны шэсць гаспадарак не прыступілі да здачы бульбы дзяржаве.

Сяляне Касцюкоўскага сельсовета яшчэ павінны ўбраць 200 гектараў бульбы. Нездавальняюча ідзе ўборка ў Летнікоўскім, Баршчэўскім і Копыскім сельсоветах.

Марудна ўбіраюць бульбу ў Зеленоўскім сельсовеце, дзе яшчэ не ўбрана 300 гектараў бульбы. Не арганізаваны тут і бульбапастаўкі.

Аб тым, наколькі ў раёне апаратыўна і канкрэтна кіруюць уборкай бульбы, гаворыць лічба выканання плана ўборкі. На 1 кастрычніка па аднаасобнаму сектару было выкапана на 34,9 процанта да плана. Калгасы ўбралі не больш 35 процантаў да плана.

План бульбапаставак па раёну выканан толькі на 16 процантаў. Раённыя работнікі замест большэвіцкага кіраўніцтва ўборкай і выкананнем абавязацельстваў перад дзяржавай абмяжоўваюцца кароткімі візітамі ў сельсоветы і калгасы. І не дзіўна, што Беластоцкі раён займае адно з апошніх месц па ўборцы і бульбапастаўках.

С. Грышын.

Марудзяць з уборкай бульбы

ВАЎКАВЫСК. **(Ад нашага карэспандэнта).** Восень уступіла ў свае правы. З кожным днём пагаршаецца надвор'е, хутка наступяць халады. Аднак, гэта ніколькі не турбуе асобных старшынь сельсоветаў і калгасаў Ваўкавыскага раёна. Яны не зразумелі таго, што пры такіх умовах толькі максімальным скарыстаннем усёй рабочай сілы і кожнай гадзіны добрага надвор'я можна забяспечыць паспяховае заканчэнне ўборкі бульбы.

У калгасе імені Сталіна, Ізабелінскага сельсовета, пачалі ўборку 2 кастрычніка. Першы дзень паказаў непадрыхтаванасць калгаса да ўборкі. Участкі за брыгадамі не замацаваны. На ўборку вышлі не ўсе калгаснікі. Многія калгаснікі заняліся копкай бульбы на ўласных агародах. За два дні калгас убраў толькі 2 гектары. Патрэбна-ж убраць 40 гектараў! Пры такіх тэмпах работы ўборка расцягнецца на 20 дзён.

У калгасе «Большэвік», Роскага сельсовета, многія калгаснікі на ўборцы бульбы паказваюць добрыя ўзоры працы. Калгасніцы Вера Сарока і Антаніна Дарошка на копцы выконваюць за дзень па паўтары нормы. Працуючы на запраўцы буртоў, Аляксей Верацiла і Вікенцій Васілеўскі выконваюць заданне на 200 процантаў. Між тым іх вопыт работы не перадаюць астатнім калгаснікам. На ўборцы працуе толькі 22 чалавекі, якія здолелі выкапаць бульбу з плошчы 5 гектараў. Калгасу-ж трэба ўбраць 38 гектараў.

Марудна праходзіць уборка бульбы ў калгасах імені Будзённага, Вярэйкаўскага сельсовета, імені 17 верасня, Гудзевіцкага сельсовета, і імені Тэльмана, Ваўкавыскага горсовета.

Аднаасобны сектар таксама паволына разгортвае ўборку. Аднаасобныя гаспадаркі Рэплянскага сельсовета ўбралі толькі 12 гектараў, Масеевіцкага— 15 гектараў, Дзевяткаўскага — 20 гектараў. І толькі аднаасобнікі Мсцібаўскага сельсовета ўбралі больш 150 гектараў.

Такія тэмпы ўборкі пагражаюць вялікімі стратамі багатага ўраджаю бульбы. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны неадкладна прыняць меры для таго, каб паскорыць уборку бульбы.

Д. Казлоў.

ЗВОНКУ ЎСЁ Ў ПАРАДКУ

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У Граеўскім раёне вельмі многа ідзе размоў аб уборцы бульбы і здачы яе дзяржаве. У райкоме партыі і райвыканкоме амаль штодзённа праводзяцца нарады па гэтаму пытанню. Выносяцца пастановы, намячаюцца розныя мерапрыемствы. Да сельсоветаў прымацаваны адказныя работнікі раёна, якія павінны праводзіць масава-палітычную работу сярод сялянства.

Звонку як быццам усё ў парадку. Прыняты ўсе меры для таго, каб у бліжэйшыя дні раён заняў адно з перадавых месц у вобласці і да пачатку асенніх замаразкаў поўнасцю і без страт убраць высокі ўраджай бульбы. Між тым на справе зусім адваротнае. Тэмпы ўборкі і здачы бульбы дзяржаве ўсё яшчэ вельмі нізкія. На 1 кастрычніка з 5.665 гектараў убрана толькі 1.718 гектараў.

У Мечынскім сельсовеце ўбрана ўсяго 30 гектараў. Старшыня сельсовета тав. Младзіноўскі разважае так: «Зараз працаваць перашкаджаюць дажджы. Установіцца добрае надвор'е, тады хутка навярстаем упушчанае».

Нездавальняюча праходзіць уборка бульбы ў Шыманскім, Белдаўскім, Бачкоўскім і іншых сельсоветах. Тут яшчэ і паловы ўраджаю не ўбрана. «Мокрыя» настроі кіраўнікоў гэтых сельсоветаў даюць сябе адчуваць.

Найпершай запаведдзю калгасаў і аднаасобных гаспадарак побач з уборкай з'яўляецца здача высокаякаснай бульбы дзяржаве. Аднак выкананне бульбапаставак у раёне зрываецца. Здадзена толькі 36,6 процанта да плана. Некаторыя сельсоветы план бульбапаставак выканалі на 10—15 процантаў. Рудскі сельсовет з плана 1.932 цэнтнеры здаў 41 цэнтнер.

Неабходна таксама адзначыць, што асобныя раённыя кіраўнікі замест канкрэтнай дзелавой дапамогі сельсоветам займаюцца гастраліраваннем па вёсках. Трэці сакратар райкома партыі тав. Тарасевіч, загадчык раённым аддзелам асветы тав. Базылеўскі за дзень умудраюцца пабываць у 3—4-х сельсоветах і даць «установкі». Карысці ад гэтых паездак вельмі мала.

В. Гарбанёў.

Цяпер жывём добра

Жыць на чатырох гектарах з васьмю едакамі ў сям'і было вельмі цяжка. Прыходзілася шукаць дадатковай работы. Але колькі-б ні заработаў, ні сабраў з поля,—усё прыходзілася ўвосень аддаваць на падаткі. Праходзілі зімы, наступалі вёсны, а ад падаткаў працоўны селянін ніколі не мог вызваліцца. На працягу 20 год улады польскіх паноў жыў з сям'ёй у канўры без вакон.

Калі да нашых Пузевічаў прышла вестка, што Чырвоная Армія ідзе да нас, я зараз-жа здабыў вінтоўку і сумесна з іншымі таварышамі пайшоў біцца з панамі.

Калі ў нашу вёску прышла Чырвоная Армія, мы сабралі сход сялян. Упершыню я тады выступаў. Хечаш сказаць слова — не можаш: захапляла надзвычайная радасць, з вачэй каціліся слёзы.

Выбралі сялянскі камітэт. Членам камітэта абралі і мяне. Мы, беднякі, атрымалі зямлю. Але мы зразумелі, што для заможнага жыцця гэтага недастаткова. Пайшлі ў раённы выканаўчы камітэт і гаворым: «Жадаем арганізаваць калгас». Нам пайшлі насустрач. Арганізавалі калгас імені Варашылава. Цяпер жывём добра, як ніколі. Старанна правялі ўборку ўраджаю. Цяпер атрымліваем па 6 кілограмаў жыта і 32 кілограмы бульбы на працадзень. Калгас мне прадаставіў новы добры дом. Зараз нават коні калгасныя знаходзяцца ў лепшым памяшканні, чым мая былая старая хацінка.

Мая сям'я мае цяпер усё неабходнае, дзеці вучацца ў школе, а я працую спакойна і радасна на нашай вызваленай зямлі.

Г. Быцкевіч,
калгаснік сельгасарцелі імені Варашылава, Скідзельскага раёна.



ЦК МОПР СССР узнагародзіў лепшых актывістаў мопраўскай работы пачотнымі граматамі. На здымку: група рабочых актывістаў МОПР Беластока, узнагароджаных пачотнай граматай ЦК МОПР: тт. С. І. Ротнер (сядзіць), стаяць (злева направа) І. І. Маргуліс, С. С. Скшынецкі, І. Г. Каплан.

Фота А. Сапіра.

ГАСТРОЛІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА

Цікавы спектакль

Багата народная творчасць, невычэрпны яе крыніцы. У ёй — сапраўднае мастацтва, непраўзыйдзенае ў сваёй мудрасці і харастве. Вечна жывая, вечна свежая і жыццесцвярджаючая, народная творчасць была і будзе цудоўнай зарой, асвятляючай шлях чалавека, магутнай сілай, аблягчаючай яго працу і барацьбу.

Лепшыя свае надзеі і чаканні, нянавісць да прыгнятальнікаў, волю да барацьбы і перамогі ўвасобіў вялікі беларускі народ у сваіх казках і песнях, пагаворках і прыказках. На працягу вякоў стагнаў ён пад прыгнётам польскіх, літоўскіх і іншых каралёў, «сваіх» і чужых князёў і магнатаў, але ніколі не схіляў ён пакорліва плечы, а мужна падніма́ўся на барацьбу і заўсёды верыў, што прыдзе час, калі пад дудку народа заскачуць каралі і магнаты, паны і падпанкі.

Прыгожую легенду пра цудоўную дудку, а таксама шэраг іншых казак і пагаворак, песень і танцаў выкарыстаў драматург В. Вольскі ў сваёй п'есе «Цудоўная дудка». Гэта —фальклорная ад пачатку да канца рэч. І ў гэтым яе вялікая сіла. Фальклор у ёй існуе не толькі як узор для стылізацыі, але і перш за ўсё як канструкцыйны фактар, які абумоўлівае кампазіцыю і стыль п'есы ў цэлым. Спектакль «Цудоўная дудка», паказаны ў Беластоку Беларускім дзяржаўным тэатрам юнага гледача, арыгінальны і хвалюючы. Запамінаюцца вобразы-персанажы, пакідаюць прыемнае ўражанне песні і танцы.

Янка. Звычайны сялянскі хлопец, які адпраўляецца ў свет шукаць праўды і шчасця. З наіўнай верай у караля ён трапляе ў каралеўскія палацы. Але суровая рэчаіснасць ушчэнт разбівае яго ілюзіі. Янка патрабуе ад караля дакумент, забараняючы панам здзеквацца над сялянамі і эксплаатаваць іх. Перапалоханы кароль усклікае: «А як-жа я? Хто будзе працаваць на мяне?» І Янка разумее: недарэчна шукаць у караля абароны.

Янка паказан сапраўдным сынам працоўнага народа. Жыццерадасны ў самыя цяжкія мінуты, мудры ў вырашэнні любых задач, ён становіцца сапраўдным народным героем у барацьбе з веліканам разбойнікам, ад якога здабывае цудоўную дудку.

На фоне нікчэмнай, тупой, агіднай каралеўскай сям'і Янка паўстае перад гледачом ва ўсёй сваёй велічы. Янка падкупляе гледача сваёй непасрэднасцю, сваім цудоўным юмарам, сваёй сілай. Гэта тыповы, праўдзівы вобраз, поўная ўдача драматурга і тэатра.

Мастацкі выведзены бацькі Янкі. Як задушэўна сумна гучыць песня сялянкі ў пачатку спектакля! Якім лірызмам авеяны гэтыя вобразы старых сялян на працягу ўсяго спектакля! А вазьміце горкі юмар старога. Колькі народнай мудрасці ў яго пагаворках і прыказках. Колькі нянавісці да прыгнятальнікаў у гэтага дзеда, які ўсё сваё жыццё аддаў рабоце на пана і зараз асуджан на бяздомнасць і жабрацтва.

А вось маладая дзяўчына Марыська. Які абаяльны вобраз! Колькі ў яе шчырага пачуцця да Янкі, веры ў лепшую будучыню! К дому бацькоў Янкі прыходзіць войт з панскімі гайдукамі, каб разбурыць хаціну і выгнаць старых у свет, куды вочы глядзяць. Марыська арганізуе жанок, што вяртаюцца з дажынак на панскі двор, і яны не дапускаюць панскіх сабак зрабіць сваю брудную справу.

Удаліся вобразы каралеўскай сям'і і прыдворных, звяртае на сябе ўвагу войт — агідны пёс пана.

Можна, безумоўна, папракнуць драматурга за вобраз веліканa. У народнай творчасці з іменем волата, веліканa, часцей за ўсё звязан вобраз народнага героя, барацьбіта за шчасце працоўных, абаронцы пакрыўджаных. Тут-жа велікан—нейкі няпэўна акрэслены разбойнік, які разбурае хаціны і палацы, рабуе краіну.

Але гэты і некаторыя іншыя недахопы не спыняюць на сабе ўвагі гледача. Сядзіш на спектаклі і бачыш: кавалак сапраўднага жыцця беларускага народа паўстаў перад вачыма. Цудоўная народная творчасць, на якой пабудаван спектакль, захапляе. Спектакль гучыць дзіўнай народнай паэмай. Свежасцю і арыгінальнасцю вее са сцэны. Сядзіш, як зачараваны, і не хочацца выходзіць, калі апусціцца занавес.

«Цудоўная дудка»—выдатны падарунак нашаму юнаму гледачу.

Т. Лясовіч.

Мы смела глядзім у будучыню

Год таму назад працоўная моладзь у былой панскай Польшчы не мела перад сабой будучыні. Шэрае, нікчэмнае жыццё.

Тав. Радзюк, каб зарабіць сабе на навуку, у час летніх канікул цяжка працаваў чорнарабочым за паўтара злотых у дзень. Тав. Варонец, сын батрака, тав. Скржэчко амаль паміралі з голаду, настойліва прабіваючы сабе шлях да вучобы. Тав. Эфроімзон, каб мець магчымасць вучыцца ў сярэдняй школе, штодзённа давала па 5 прыватных урокаў. А скончыўшы сярэднюю школу, нідзе не вучылся, бо ва ўніверсітэт яе не прынялі.

Падобных прыкладаў можна прывесці многа. Дзеці працоўных былой панскай Польшчы маглі толькі марыць аб універсітэце. І сапраўды, хіба мог сын бедняка вучыцца разам з сынамі паноў Радзівіла, Сапегі ці Патоцкага! Цяпер гэта здаецца кашмарным сном. Вялікая Сталінская Канстытуцыя прадаставіла нам права на асвету. Цяпер мы смела глядзім у будучыню.

Вялікае шчасце выпала на нашу долю—мы студэнты першага ў заходніх абласцях БССР педагагічнага інстытута. Мы гардзімся вялікай і пачэснай задачай, якая ўскладзена на совецкіх педагогаў. Мы не толькі будзем авалодваць навукай, але і ваеннай справай, каб у любую мінуту стаць на абарону нашай любімай бацькаўшчыны. Вялікае дзякуй нашай слаўнай Чырвонай Арміі і роднаму Сталіну за наша вызваленне, за новае шчаслівае жыццё.

Студэнты пединстытута:
Ю. Радзюк, А. Шырма, П. Варонец, С. Скржэчко, Л. Эфроімзон.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ
(Пісьмо ў рэдакцыю)

Намеснікам начальніка лестрансгаса на станцыі Чорная Весь працуе тав. Зюкаў. Для ўкамплектавання абозу ён рашыў купіць калёсы, заплаціўшы за іх 1.000 рублёў. Аказваецца, што калёсы зусім паламаныя. Цяпер за рамонт іх просяць 1.000 рублёў. Такім чынам у лестрансгасе няма ні калёс, ні сродкаў на гэтыя мэты.

Аб гэтым факце паведамлялася ў насценгазеце. Аднак начальнік лестрансгаса на заметку не рэагіруе.

А. Кор.

З А Р У Б Я Ж О М

Заява Гандзі

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бамбея, Гандзі заявіў, што «у Індыі не будзе праведзена кампанія грамадзянскай непаслухмянасці, не гледзячы на разыходжанне з віцэ-каралём па пытанню аб свабодзе слова».

—0—

ПРАЕКТ СТВАРЭННЯ СУМЕСНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ПА АБАРОНЕ ЗША І МЕКСІКІ

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Крысчэн сайенс монітор» у добра інфарміраваных дыпламатычных крутах Вашынгтона лічаць, што ЗША і Мексіка створаць сумеснае ўпраўленне па абароне ЗША і Мексікі, падобнае амерыкана-канадскаму ўпраўленню.

—0—

АСАДНАЕ СТАНОВІШЧА ВА ФРАНЦУЗСКАЙ ЗАХОДНЯЙ АФРЫЦЫ

БЕРЛІН. (ТАСС). Як паведамляе Германскае інфармацыйнае бюро, вярхоўны камісар Французскай Афрыкі Буасон аб'явіў асаднае становішча ва Французскай Заходняй Афрыцы.

—0—

ВАЕННАЕ ПАГАДНЕННЕ ПАМІЖ ДЭ ГОЛЕМ І АНГЛІЙСКІМ КАМАНДАВАННЕМ

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, французская газета «Се жур» публікуе ў сваім першым нумары тэкст пагаднення, заключанага ў пачатку жніўня паміж Чэрчылем і дэ Голем аб умовах ваеннага супрацоўніцтва паміж войскамі дэ Голя і англійскімі ўзброенымі сіламі.

—0—

БАМБАРДЫРОЎКА ЛОНДАНА

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў мінулую ноч звыш 100 германскіх самалётаў скінулі бомбы на Лондан і важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёва-Усходняй і Ўсходняй Англіі.

У гэтую ноч ні адзін англійскі самалёт не паявіўся над тэрыторыяй Германіі.

Не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, германская авіяцыя працягвала аперацыі супроць Лондана. Толькі за 24 гадзіны, пачынаючы з палудня 2 кастрычніка да палудня 3 кастрычніка, у Лондане 7 разоў аб'яўлялася паветраная трывога.



Жылы дом на Рытэрштрасе ў Берліне, разбураны ў рэзультаце бамбардыроўкі англійскай авіяцыяй. Фота ТАСС.

ПАШЫРЭННЕ АМЕРЫКАНСКАЙ АВІЯЦЫЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, член камітэта нацыянальнай абароны ЗША Кнудсен пасля прагляду авіяцыйнага завода ў г. Іст-Хартфордзе (штат Конекцікут) заявіў, што ў інтарэсах абароны ўся амерыканская авіяцыйная прамысловасць павінна быць моцна пашырана. Ён указаў, што для гэтага неабходна ў тры разы павялічыць плошчу авіяцыйных прадпрыемстваў і ў чатыры разы — лік занятых на іх рабочых.

Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс з г. Буфало (штат Нью-Ёрк), авіяцыйная фірма «Кертыс Райт» аб'явіла, што яна тэрмінова прыступіла да будаўніцтва новага авіяцыйнага завода коштам у 18 мільёнаў долараў. Акрамя таго, фірма намячае будаўніцтва двух заводаў у іншых гарадах краіны. Карэспандэнт адзначае, што на авіяцыйных заводах гэтай фірмы будзе занята 45 тысяч рабочых, зараз занята 9.200 рабочых.

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс з Вашынгтона, пачынаючы з 1 ліпеня ваеннае і марское міністэрствы ЗША размясцілі заказы прыкладна на 20 тысяч самалётаў і авіяцыйных матораў. Заказы, размешчаныя ваенным міністэрствам, ацэньваюцца ў 1 мільярд 4 мільёны долараў, у той час як заказы марскога міністэрства складаюць 223 млн. долараў. Амерыканская армія мае 3.500 самалётаў, акрамя 2000 самалётаў, заказаных яшчэ да 1 ліпеня. Па даных марскога міністра Нокса, амерыканскі ваенна-марскі флот мае звыш 1.800 прыгодных самалётаў, з якіх 1.234 могуць быць выкарыстаны для ваенных аперацый. Нокс заявіў, што марское міністэрства размясціла заказы на 3 тыс. самалётаў. Па яго словах, ужо амаль закончаны перагаворы аб размяшчэнні заказаў яшчэ на 4 тысячы самалётаў.

Планы абароны ЗША і Канады

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, члены пастаяннага сумеснага ўпраўлення па абароне ЗША і Канады заявілі, што ўпраўленне закончыла складанне даклада, які рэкамендаваў унесці неадкладныя змены ў сістэму абароны ціхаакіянскага і атлантычнага ўзбярэжжа ЗША і Канады. Дэталі даклада не паведамляюцца. Прадстаўнік ЗША ва ўпраўленні Ла Гардзіа адмовіўся каментыраваць чуткі аб тым, што Злучаныя Штаты, магчыма, размесцяць войскі ў Ньюфаундлендзе або ў якіх-небудзь пунктах Канады.

Афіцыяльна аб'яўлена, што наступнае пасяджэнне пастаяннага сумеснага ўпраўлення па абароне ЗША і Канады адбудзецца 11 лістапада ў Сан-Францыска, пасля чаго члены ўпраўлення наведаюць іншыя пункты ціхаакіянскага ўзбярэжжа ЗША і Канады.

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Як перадае агенцтва Канадыэн Прэс з Отавы, канадскі прэм'ер Кінг заявіў, што міністр нацыянальнай абароны Галстон накіруецца ў Англію для нарады па пытаннях абароны. Нядаўна было аб'яўлена аб паездцы ў Англію міністра сельскай гаспадаркі Канады для нарады па пытаннях харчовага снабжэння.

Адказваючы на пытанне адносна экспарта металаў з Канады ў Японію, Кінг заявіў, што Канада нядаўна спыніла вываз жалезнага і стальнога лому.

НОВЫ АМЕРЫКАНСКІ ЗНІШЧАЛЬНІК

НЬЮ-ЁРК. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, пасля наведання авіяцыйнага завода фірмы «Юнайтэд эйркраф корнарэйшн» амерыканскі адмірал Тауэрс заявіў, што новы амерыканскі знішчальнік, які будуецца на гэтым заводзе, будзе «выключна скарасным». Па маючыхся звестках, працягвае агенцтва, новы знішчальнік абсталяван маторам фірмы «Прат і Уітні» магутнасцю ў 2 тыс. конскіх сіл. Ён развівае хуткасць звыш 640 кілометраў у гадзіну. Яго радыус дзеяння — 2.700 кілометраў.

Абмеркаванне ў ЗША пытання аб аказанні фінансавай дапамогі Англіі

НЬЮ-ЁРК, 4 кастрычніка. (ТАСС). За апошні час наглядаюцца прызнакі, якія сведчаць аб тым, што Рузвельт зараз не намеран дабівацца адмены артыкулаў закона аб нейтралітэце і закона Джонсона, забараняючых прадастаўленне крэдытаў Англіі. Аднак некаторыя вельмі ўплыўныя кругі як унутры кангрэса, так і зне яго патрабуюць хутчэйшага прыняцця такога рашэння.

Па словах газеты «Нью-Ёрк геральд трыбун», не прыходзіцца здзіўляцца таму, што Рузвельт перад тварам прыбліжаючыхся прэзідэнцкіх выбараў спрабуе пазбегнуць дыскусіі ў кангрэсе па пытанню аб аказанні фінансавай дапамогі Англіі. Але зусім ясна, што ў самы бліжэйшы час Злучаным Штатам прыдзецца вырашыць гэта пытанне. Газета патрабуе, каб кангрэс адобрыў прапанову сенатара Кінга, якая дазваляе прадаставіць Англіі крэдыт.

Сабатаж на англійскіх суднах у партах ЗША

НЬЮ-ЁРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у Балтыморскім порце выяўлены факты сабатажу на англійскіх параходах. Паводле паведамлення газеты «Балтымор сэн» змазачнае масла, якое скарыстоўваецца на гэтых параходах, аказалася разбаўленым нейкай вадкасцю. Па другіх звестках пітцёвая вада на англійскіх параходах была заражана тыфознымі мікробамі.

Агенцтва ўказвае, што ўлады берагавой аховы ўзмацнілі патруль у Балтыморскім порце.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

Дзеянні англійскай авіяцыі

ЛОНДАН, 7 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае камюніке англійскага міністэрства авіяцыі, у якім гаворыцца, што ўчора ўдзень англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Остэндзе, Кале і Булонь. Акрамя таго, бамбардыроўцы падвергліся скапленні суднаў і барж у Гарлінгене, Стафорэне, Энкгейзене, Дардрэхце і Гельдэрэ. У Гельдэрэ зарэгістрыравана прамое пападанне бомбы ў гандлёвы параход. Англійскія самалёты бамбардыравалі таксама аэрадром у Дзінгольдэ (Германія). У час гэтых аперацый англійскі бамбардыроўшчык «Бленхейм» збіў непрыяцельскі знішчальнік. Англійская авіяцыя не мела страт. Самалёт берагавой абароны зрабіў учора раніцой налёт на галандскае ўзбярэжжа і падверг бамбардыроўцы два германскіх узброеных гандлёвых параходы.

—0—

НАЛЁТЫ ГЕРМАНСКІХ САМАЛЁТАЎ НА ЛОНДАН

НЬЮ-ЁРК, 7 кастрычніка. (ТАСС). Лонданскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што 7 кастрычніка падвергліся бамбардыроўцы два паўднёва-усходніх раёны Лондана. Над паўднёва-усходнім узбярэжжам англійскія самалёты ўступілі ў бой з германскімі самалётамі. Бомбы былі скінуты над графствам Кент. Адзін германскі самалёт знішчыў два аэрастаты паветранай загароды ў раёне Дуўра. Германскія самалёты лятаді па аднаму або невялікімі групамі.

—0—

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ АБ НАЛЁТАХ ГЕРМАНСКАЙ АВІЯЦЫІ НА ЛОНДАН

НЬЮ-ЁРК, 7 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, упершыню, пачынаючы з 7 верасня, на працягу усёй учарашняй ночы Лондан не падвергся бамбардыроўцы. Бамбардыроўка горада германскай авіяцыяй аднавілася толькі сёння на досвітку.

Па паведамленню лонданскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, неспрыяючае надвор'е і моцныя вятры, як мяркуюць, перашкаджаюць паветраным налётам на Англію. Карэспандэнт паведамляе, што, згодна неафіцыяльных статыстычных даных, на працягу апошняга тыдня лік забітых у рэзультаце паветраных бамбардыровак Англіі паменшыўся на 75 процантаў, а лік раненых на 25 процантаў.

—0—

СТРАТЫ ГЕРМАНСКАЙ РАТАВАЛЬНАЙ СЛУЖБЫ

БЕРЛІН, 7 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германская марская ратавальная служба панясла вялікія страты ў выніку англійскіх налётаў. Задачай гэтай службы з'яўляецца ратаванне экіпажаў збітых самалётаў паблізу брытанскіх астравоў. Паўночнае мора і Ла-Манш безупынна ахоўваюцца самалётамі, лятаючымі лодкамі і ратавальнымі лодкамі. Толькі ў жніўні і верасні англічанамі знішчана 10 ратавальных самалётаў. За два апошніх месяцы гэтай службы, паведамляе агенцтва, было выратавана 226 лётчыкаў, сярод якіх знаходзяцца таксама экіпажы некалькіх англійскіх самалётаў.



Узорны парфумерны магазін Беластоцкага горхарчпромгандлю № 51 (па Ленінскай вуліцы).

На здымку: прадаўшчыцы Д. К. Штурман і Х. Р. Юдэлеўская адпускаюць тавар пакупнікам. Фота А. Сапіра.

Год таму назад

(Хроніка падзей)

8 кастрычніка. На ўсіх прадпрыемствах арганізаваны гурткі па вывучэнню «Парадку выбараў у Народнае Сабранне». Агітатараў засыпаюць сотнямі пытанняў. Многія рабочыя здзіўлены, чаму фабрыкантам прадастаўляецца права галасаваць на выбарах дэпутатаў у Народнае Сабранне. Ці не можа здарыцца, што хто-небудзь з фабрыкантаў трапіць у дэпутаты?

Прыходзілася таварышам растлумачваць, што ўсё залежыць ад актыўнага ўдзелу ў выбарах усіх працоўных, ад іх рэвалюцыйнай пільнасці. Вылучаць-жа кандыдатаў будзе рабочы калектыў. А хіба рабочыя захочуць вылучыць эксплаататара і крывапіўцу ў дэпутаты Народнага Сабрання?

У гэтыя напружаныя перадвыбарчыя дні не драмаў і вораг. Шляхам запалохвання і пагроз ворагі імкнуліся ўнесці дэзарганізацыю ў ход падрыхтоўкі да выбараў. Яны выкарыстоўвалі паркаы, сцены заводскіх прыбіральняў для ўсякіх контррэвалюцыйных заклікаў. У вёсках паявіліся нейкія «святыя старцы», якія хадзілі па хатах і ўгаворвалі сялян не ўдзельнічаць у выбарах у Народнае Сабранне. Штодзённа, штогадзінна распаўсюджваліся ўсякія правакацыйныя чуткі. Англійскае і французскае радыё напаўняла эфір усемагчымымі ўткамі. Былі выпадкі замахаў на жыццё агітатараў і актывістаў.

Але ўсе гэтыя нікчэмныя спробы астаткаў неразгромленых ворагаў народа былі асуджаны на правал. Мільённыя масы працоўных актыўна рыхтуюцца да выбараў, як да ўсенароднага свята.

Іванаўскія тэкстыльшчыкі звярнуліся з пісьмом да тэкстыльшчыкаў Беластока. Іванаўцы расказалі, якое шчаслівае і радаснае іх жыццё без фабрыкантаў, без эксплаататараў, як вырасла Іванава, як выраслі людзі.

«22 годы таму назад нашы фабрыканты запалохвалі нас, — пісалі іванаўцы, — што без іх у нас нічога не выйдзе. Але мы не спалохаліся. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна мы прайшлі праз усе выпрабаванні: ведалі голад, разбурэнне, недахоп сыравіны. Але гэты час прашоў беззваротна... Не верце паклёпу ворагаў народа. Смела станавіцеся за станкі, выпускайце больш прадукцыі».

У канцы свайго пісьма іванаўскія тэкстыльшчыкі запрашаюць дэлегацыю беластоцкіх тэкстыльшчыкаў прыехаць у Іванава на святкаванне XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Пісьмо іванаўскіх тэкстыльшчыкаў абмяркоўвалася на ўсіх сходах рабочых. Тэкстыльшчыкі Беластока рыхтавалі адказ іванаўцам.

Дзень выбараў дэпутатаў у Народнае Сабранне ўстаноўлен 22 кастрычніка.

Сустрэча з артыстамі тэатра Юнага гледача

Днямі ў 9-ю сярэднюю школу прышлі ў госці кіраўнікі і артысты мінскага тэатра Юнага гледача, які гастраліруе зараз у Беластоку. Рэжысёр В. Меероўскі выступіў перад вучнямі старшых класаў з дакладам аб жыцці і творчасці Мікалая Астроўскага. Артыст Стэльмах расказаў, як калектыў тэатра працаваў над пастаноўкай спектакля «Як гартавалася сталь».

Мастацкі кіраўнік тэатра тав. Сухарэў пазнаёміў прысутных з рэпертуарнымі планамі тэатра ў будучым.

* * *

Сёння ў беластоцкім Доме пісьменніка ў 8 гадзін вечара адбудзецца арганізаваны гаркомам партыі і камсамола і калектывам тэатра Юнага гледача вечар, прысвечаны абмеркаванню пастаноўкі п'есы «Як гартавалася сталь». З дакладам аб творчасці Н. Астроўскага выступіць рэжысёр тэатра тав. Мееро̆ўскі.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Сёння, 8-га кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у беластоцкім Доме партасветы будзе прачытана **лекцыя** на тэму: **«Гістарычны матэрыялізм».**

Лекцыю чытае лектар тав. Дымчэнка. Уваход па білетах. Цана білета — 1 рубель. Білеты прадаюцца штодзённа з 9 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара ў бібліятэцы Дома партасветы.

11 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у памяшканні беластоцкага Дома партасветы будзе прачытана **лекцыя** на тэму: **«Міжнароднае становішча».** Лектар — тав. Токараў.

Уваход па білетах. Білеты прадаюцца ў бібліятэцы Дома партыйнай асветы штодзённа з 9 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта

На падставе пастановы СНК БССР № 180 ад 1 сакавіка 1936 г аб абавязковых прышчэпках супроць дыфтэрыі і з прычыны паўтараючыхся выпадкаў захворванняў дыфтэрыяй дзяцей у горадзе Беластоку, Беластоцкі горвыканком пастанаўляе:

1. Усе дзеці ва ўзросце ад 1 да 9 год, пражываючыя ў гор. Беластоку, падлягаюць абавязковым прышчэпкам супроць дыфтэрыі.
2. Дзеці, якім патрэбна зрабіць прышчэпку, не могуць быць прыняты ў дзіцячыя ўстановы (яслі, дзіцячыя сады, школы) без даведкі аб прышчэпцы супроць дыфтэрыі. Адказнасць за дакладнае выкананне гэтага пункта ўскладаецца на загадчыкаў дзіцячымі ўстановамі, дырэктараў школ і т. д.
3. Рабіць прышчэпкі даручыць Санэпідэмстанцыі, дзіцячым кансультацыям, дзіцячым паліклінікам, школьным і ясельным урачам.
4. Кантроль за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на гарадскі аддзел аховы здароўя і Дзяржсанінспекцыю горада Беластока.
5. Вінаватыя ў нарушэнні данай пастановы падвяргаюцца штрафу да 100 рублёў або прымусовым работам да 15 дзён.
6. Гэта пастанова ўваходзіць у сілу з дня апублікавання.

Старшыня Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта **РАЖНОЎСКІ**

Сакратар Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта **ОКУНЬ**

УБ. — 62. Друкарня Беластокдрук.